*Літ.*: Древлянский П. [Шпилевский П.]. Белорусские народные поверья // Журн. М-ва нар. просвещения. 1852. Лит. прибавление № 3.

*У. А. Васілевіч.*

**РАЗАМА́РА**, нядобры дух, адзін з тых, хто нясе ў паветры вогненную ступу Бабы Ягі і карыстаецца яе вялікай міласцю. Жыве ў аблоках у выглядзе шасцікрылай жывёліны. У выпадку патрэбы з'явіцца на зямлю Р. прымае аблічча маладога чалавека, калматага з галавы да ног, вогненнага, з шасцю крыламі. У такім выглядзе Р. з'яўляецца апоўначы і асабліва ў час буры, навальніцы, ліўня і крадзе дзяцей. Звычайна, калі дзеці крычалі, плакалі, іх палохалі: «Разамара б цябе задушыў — які крыкса!» Вядомы па ўсёй Беларусі, у некаторых мясцінах Мінскай губерні гэтае слова ўжывалася ў значэнні замарашкі. П.Шпілеўскі трактаваў яго як няўлоўнага духа, невідзімку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ